*5.* Фантастический сектор экономики Великобритании [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.culturepartnership.eu/article/ fantasticheskiy-sektor-ekonomiki-velikobritanii. – Дата доступа: 19.11.2021.

*6. Хоркхаймер, М.* Диалектика просвещения / М. Хоркхаймер, Т. Адорно; пер. с нем. М. Кузнецова. – СПб. : Медиум, 1997. – 310 с.

*7. Цзин, Ту.* Новая жизнь старого завода / Ту Цзин // Китай. – 2021. – № 4. – С. 38–40.

*8. Чэнь, Цзянь*. Новая жизнь промышленного городка / Цзянь Чэнь // Китай – 2019. – № 11. – С. 40–43.

УДК 003:159.964.26

***Т. Ф. Сухоцкая,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт,*
*дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,*
*Рэспубліка Беларусь*

# ПСІХААНАЛІТЫЧНАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ СІМВАЛА

**Анатацыя.** У гуманітарыстыцы склалася ўплывовая псіхааналітычная традыцыя даследавання сімвала. Зыходзячы з разумення несвядомага ў З. Фрэйда (паводзіны чалавека дэтэрмінуюцца інстынктыўнай прыродай несвядомага), К. Г. Юнга (надаваў перавагу сацыякультурнай і сімвалічнай прыродзе несвядомага), Ж. Лакана (дэбіялагізаваў класічны псіхааналіз і змясціў акцэнт у вобласць мовы) і інш., раскрываецца прырода і сэнс дадзенага паняцця. У межах фрэйдаўскага псіхааналізу (Ж. Лакан, Э. Фром) сімвал разумеецца як выражэнне цягаў, выціснутых у індывідуальнае несвядомае. Аналітычная псіхалогія зыходзіць з таго, што архетыпны вобраз/сімвал указвае не толькі на несвядомае і сэксуальнасць, але і сферу нумінознага, трансцэдэнтальнага. Юнгіянцы і фрэйдысты сыходзяцца на тым, што здольнасць да сімвалізацыі не залежыць ад расавых, этнічных, сацыякультурных адрозненняў. Агульнасць сімволікі выцякае з фундаментальных асаблівасцей чалавечай псіхікі.

**Ключавыя словы:** сімвал, несвядомае, псіхааналіз, аналітычная псіхалогія, калектыўнае несвядомае, архетып, архетыпны вобраз.

***T. Sukhotskaya,***
*Candidate of Cultural Studies, Associate Professor, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution “Belarusian State University of Culture and Arts",*
*Republic of Belarus*

# PSYCHOANALYTIC INTERPRETATION OF THE SYMBOL

**Abstract.** An influential psychoanalytic tradition of symbol research has developed in humanitarianism. Based on the understanding of the unconscious in Z. Freud (human behavior is determined by the instinctive nature of the unconscious), C. G. Jung (gave preference to the socio-cultural and symbolic nature of the unconscious), J. Lacan (anthropologized classical psychoanalysis and placed emphasis in the field of language), etc., reveals the nature and meaning of this concept. Within the limits of Freudian psychoanalysis (J. Lacan, E. Fromm), the symbol is understood as an expression of drives repressed into the individual unconscious. Analytical psychology proceeds from the fact that the archetypal image/symbol indicates not only the unconscious and sexuality, but also the sphere of the numinous, the transcendental. Jungians and Freudians agree that the ability to symbolize does not depend on racial, ethnic, socio-cultural differences. The commonality of symbolism follows from the fundamental features of the human psyche.

**Keywords:** symbol, unconscious, psychoanalysis, analytical psychology, collective unconscious, archetype, archetypal image.

Сапраўднай мэтай чалавечай жыццядзейнасці з'яўляецца асэнсаванне свету праз пазначэнне яго складнікаў-рэчаў. Асноўнымі спосабамі абазначэння з'яўляюцца знакі і знакавыя сістэмы, вобразы і сімвалы. Прырода сімвалічнага надзвычай складаная і звязана з фундаментальнымі характарыстыкамі чалавечага быцця і свядомасці. У межах філасофска-культуралагічнага аналізу сімвал неаднаразова пераасэнсоўваўся з розных пазіцый: антагнасеалагічных, мастацка-эстэтычных, гісторыка-генетычных, семантычных, герменеўтычных, семіятычных, фенаменалагічных, кагнітыўна-псіхалагічных і інш. Аб прыродзе сімвала, яго сэнсе, змесце і выкарыстанні пісалі І. Кант і Ф. Шлегель, Э. Касірэр, К. Леві-Строс, А. Белы, А. Ф. Лосеў і Ю. М. Лотман. У мове культуры сімвал валодае наступнымі прыкметамі: шматзначнасцю; асацыятыўнасцю; аб'ядноўвае ў сабе ідэальнае, канкрэтнае і абстрактнае; ніколі не ўзнікае сам па сабе, але заўсёды выступае як форма выказвання спасцігнутага чалавекам сэнсу.

У сучаснай гуманітарыстыцы склаліся два падыходы да асэнсавання прыроды і сутнасці сімвала, зыходзячы з яго ўнутранай дыхатамічнасці: семіятычны і псіхааналітычны.

Першы (пераважае ў філасофскіх і культуралагічных работах) разумее сімвал як асобы канвенцыйны знак, значэнні якога добра зразумелыя і могуць захоўвацца ў адносна нязменным выглядзе пры пераходзе культурных кодаў і перадачы культурных традыцый. У межах псіхааналізу сімвал разглядаецца як феномен, што спалучаны ў першую чаргу з трансцэндаваннем і рэпрэзентацыяй «звышрэальных» сэнсаў як праяўленне прыроджаных псіхічных структур, першасных схем («матрыц») вобразаў, з дапамогай якіх сістэматызуецца, азначаецца і кадзіруецца значная інфармацыя. Падкрэсліваецца яго медыятыўная роля як асаблівага пасрэдніка паміж дзвюма рэальнасцямі, яго сувязь з першаснымі, старажытнымі, архетыпнымі вобразамі. Сэнс сімвала фактычна не мае фіксаванай прывязкі, але кожны раз вызначаецца сітуацыйна, кантэкстуальна, дыскурсіўна. Працэс разумення сімвала прадстаўляецца як працэдура «адчування», калі не захоўваюцца выразныя, раз і назаўжды ўстаноўленыя межы паміж аб'ектыўным і суб'ектыўным, азначаючым і азначальным. Сэнс сімвала нельга дэшыфраваць, у яго трэба «ўжыцца», ён не існуе як нейкая рацыянальная формула, якую можна «ўкласці» ў вобраз і затым «выняць» з вобраза. У псіхааналізе паняцце «сімвал» выкарыстоўваецца, як правіла, пры разглядзе сноў і сімптомаў псіхічных захворванняў.

З. Фрэйд разумеў сімвал як выказванне інстынктаў выцесненага несвядомага. У сілу складанасці вучоны пазбягаў распрацоўваць гэта паняцце ў псіхааналізе і ніколі не даваў яго вызначэння. Упершыню выкарыстаў гэты тэрмін у працах па канверсійнай істэрыі як «сімвал ўспамінаў» аб траўматычных перажываннях, супастаўляючы сімвал і сімптом як ідэнтычныя паняцці, а пасля стаў ужываць яго пры тлумачэнні сноў і аналізе неўрозаў, надзяляючы змястоўным значэннем. Калі спачатку ў псіхааналітычнай тэорыі пад сімвалізацыяй разумеўся каўзальны працэс замяшчэння аднаго аб'екта іншым, замяшчэнне душэўнага стану фізічным (саматычным), заснаваным на іх падабенстве, калі адно цягнула за сабой іншае, то ў далейшых даследаваннях гэта разуменне пашырылася, і паміж сімвалізуемым і сімвалам з'явіліся так званыя адносіны замяшчэння, пры якіх ужо змест якога-небудзь цэласнага праблематычнага, канфліктнага, непрымальнага для асобы ўяўлення замяняўся

іншым, менш цэнзурыраваным. З. Фрэйд лічыў, што сімвал мае пастаяннае значэнне, якое выяўляецца ў фальклоры, норавах, звычаях. Сімволіка можа ўтрымліваць стэрэатыпы, абумоўленыя культурным асяроддзем [1, с. 134, 141].

Распрацоўка К. Г. Юнгам новага разумення несвядомага абумовіла інтэрпрэтацыю сімвала як формы выражэння архетыпаў калектыўнага несвядомага. Таксама ён адрознівае знак і сімвал, разумеючы пад знакам выраз або малюнак чаго-небудзь невядомага; разглядаючы сімвал як нешта большае, чым «просты» выраз сексуальнасці; падкрэсліваючы насычанасць мовы знакаў. Культурныя сімвалы захоўваюць у сабе многа ад сваёй першапачатковай нумінознасці (сакральнасці, боскасці) [2, с. 43]. Не тоеснымі ў К. Г. Юнга з'яўляюцца сімвал і сімптом. Ён лічыць, што існуюць індывідуальныя псіхічныя прадукты, якія маюць сімвалічны характар. Для індывіда яны маюць падобнае функцыянальнае значэнне, як сацыяльны сімвал для шырокай групы людзей. Аднак паходжанне гэтых прадуктаў ніколі не бывае выключна свядомым або выключна несвядомым, бо яны ўзнікаюць з іх раўнамернага ўзаемадзеяння. З пазіцыі К. Г. Юнга сімвалічным з'яўляецца такое слова ці вобраз, значэнне якога выходзіць за рамкі прамога і не паддаецца дакладнаму вызначэнню або тлумачэнню; сама ж спроба пазнання сімвала можа прывесці да ідэй, што ляжаць па-за межамі логікі. Сімвалічная тэрміналогія таксама ўжываецца для абазначэння паняццяў, вызначэнне або разуменне якіх нам не падуладна. Для вучонага сімвалы не падмяняюць рэальнае быццё, а спрыяюць станаўленню самасвядомасці і цэласнай асобы, працэсу індывідуацыі.

Змена трактовак сімвала ў псіхааналітычнай тэорыі К. Г. Юнга стала фактарам «дэканструкцыі» фрэйдаўскай канцэпцыі структуры асобы, што яскрава пацвярджаецца структурным псіхааналізам Ж. Лакана. У дакладзе «Інстанцыя літары ў несвядомым, або Лёс розуму пасля Фрэйда», прачытаным у Сарбоне ў маі 1957 г., аўтар структурнага псіхааналізу выяўляе ў псіхіцы тры рэгістры – рэальны, уяўляемы і сімвалічны. Яны праяўляюцца не храналагічна, а толькі ўсе разам, бо кожны з іх магчымы толькі за кошт з'яўлення двух іншых – усе разам яны завязваюцца ў вузел.

Несвядомае мае адносіны не да біялагічнай патрэбы, а да культуры і сацыялізацыі, таму яно не хаатычнае, як лічыў

З. Фрэйд, а ўпарадкавана і структуравана мовай. Моўная структура несвядомага прадугледжвае, што яно можа быць «прачытана», інтэрпрэтавана як тэкст. Гэта азначае, што хвароба, псіхічны канфлікт або сімптом заўсёды зашыфраваны ў мове, значыць, сродкамі мовы павінна адбывацца лячэнне.

Рэальнае – гэта дамоўнае несвядомае, якое знаходзіцца за межамі мовы, не можа быць перажыта ў вопыце, катэгарычна супраціўляецца сімвалізацыі і, значыць, знаходзіцца па той бок сімвалічнага.

Рэгістр уяўляемага звязаны з прадстаўленнямі аб самім сабе, гэта комплекс ідэнтыфікацый і прадстаўленняў, якія выпрацоўваюцца для набыцця ілюзіі цэласнасці, сінтэзу і аўтаноміі «Я». Перыяд фарміравання ўяўляемага Ж. Лакан назваў «стадыяй люстэрка». Вобраз, створаны ў гэты час, захоўваецца на ўсё жыццё.

Сімвалічнае валодае лінгвістычным вымярэннем, звязана са словам, мовай, і ў гэтай якасці яно з’яўляецца значным для псіхааналітычнай тэорыі і практыкі. З дапамогай сімвалічнага рэгістра адбываецца канструяванне чалавека. Усе чалавечыя істоты ўдзельнічаюць у сімвалічным свеце. Яны ўключаны ў яго, перажываюць яго і выступаюць яго носьбітамі. Чалавек – істота прынцыпова пазапрыродная, фарміраванне яго цалкам адбываецца ў сферы культуры, а цягі, прыхільнасці – сімвалічныя культурныя ўтварэнні.

Э. Фром у працы «Забытая мова» (1951), прысвечанай тлумачэнню сноў, вылучыў тры тыпы сімвалаў: умоўныя, выпадковыя і ўніверсальныя. Умоўныя – найбольш вядомыя і выкарыстоўваюцца чалавекам у штодзённай мове. Выпадковыя сімвалы з’яўляюцца супрацьлегласцю ўмоўных, бо сувязь паміж падзеяй і сімвалам усталёўваецца самім чалавекам. Ва ўніверсальных – паміж сімвалам і тым, што ён пазначае, існуе ўнутраная сувязь. Яна ўспрымаецца ўсімі людзьмі аднолькава.

Сімвалічная мова – гэта мова, у якой унутраныя перажыванні, пачуцці і думкі выражаны так, нібыта яны з’яўляюцца пачуццёвымі перажываннямі, падзеямі знешняга свету. Гэта адзіная ўніверсальная мова чалавечай расы, аднолькавая для ўсіх культур. Яна мае сваю граматыку, сінтаксіс, якія неабходна зразумець, калі хочаш спасцігнуць сэнс міфаў, чароўных казак і сноў [3, с. 10]. Знешні свет з’яўляецца сімвалам унутранага свету, душы і розуму.

Такім чынам, пры аналізе значэння сімвала ў псіхааналітычнай традыцыі важна ўлічваць спецыфіку разумення несвядомага кожным даследчыкам. Так, у канцэпцыі З. Фрэйда акцэнт ставіўся выключна на выцесненым індывідуальным, несвядомым, таму і сімвал разглядаўся як форма выказвання схаванага жадання. У творчасці К. Г. Юнга ўвага скіравана на калектыўнае несвядомае. Філосаф звярнуўся да архаічнай спадчыны чалавецтва, што і знайшло адлюстраванне ў разуменні ім сімвала як формы выражэння архетыпаў. Нарэшце, Ж. Лакан падкрэсліваў лінгвістычны і семіятычны характар несвядомага, фіксаваў ролю «Іншага» ў фарміраванні ўнутранага свету асобы, што, у канчатковым рахунку, атрымала выраз у разуменні ім сімвала як кампанента дыскурсіўных практык. У Э. Фрома сімвалы ў плане знакавай будовы ўяўляюць сабой іканічныя знакі, а ў плане спосабу прадстаўлення – вобразы.


1. *Фрейд, З.* О психоанализе : лекции / З. Фрейд. – Минск : Харвест, 2007. – 416 с.

2. *Юнг, К. Г.* Архетип и символ / К. Г. Юнг – М. : Renaissance, 1991. – 304 с.

3. *Фромм, Э.* Забытый язык: Введение в понимание снов, волшебных сказок и мифов : пер. с англ. / Э. Фромм. – Ангарск : Формат, 1994. – 161 с.



УДК 398.8(476)"20"



***І. В. Хамутова,***

*магістр культуралогіі, выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Рэспубліка Беларусь*


# ЗАХАВАННЕ ЛАКАЛЬНЫХ АСАБЛІВАСЦЕЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў XXI ст.


**Анатацыя.** На мяжы XX–XXI стст. на традыцыйную свядомасць вясковых жыхароў моцна паўплывалі ўмовы глабалізацыі – павышэнне сацыяльнай мабільнасці, дэфармацыя традыцыйнай сацыяльнай іерархіі,